Гісторыя развіцця бібліятэчнай справы ў Мастоўскім раёне непасрэдна звязана з тымі падзеямі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі.

У 1939 годзе, пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з Усходняй у адзіную рэспубліку пачалі праводзіцца сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні. За кароткі час: 1 год і 9 месяцаў (менавіта столькі часу прайшло да пачатку Вялікай Айчыннай вайны), у раёне адбылося шмат перамен. У 1940 годзе было ўведзена бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, адчынена бальніца. Разгортвалася культурна-асветніцкая работа, была адкрыта раённая бібліятэка, Дом сацыялістычнай культуры.

Але гэта доўга не працягнулася: быў чэрвень 1941г. Апошні пратакол пасяджэння райкома партыі датаваны 17 чэрвеня 1941г. Да пачатку вайны заставалася 5 дзён...

## 40-я гады

У час Вялікай Айчыннай вайны фашысты знішчылі шмат устаноў культуры ў раёне. Асаблівую цікавасць прадстаўляе сабой архіўны дакумент "З рэестра актаў уліку ўрону, які быў прычынены нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўстановам адукацыі Мастоўскага раёна (у рублях)", дзе падлічаны ўрон не толькі ўстаноў адукацыі, але і некаторых устаноў культуры: "...Изба-читальня Мосты, акт 23/ II- 45г. – 113200 ...... Райбиблиотека г.Мосты 14/ II- 45г. – 36600 ... Председатель областной комиссии по учёту ущерба П.Калинин, Ответственный секретарь комиссии по учёту ущерба Л.Вульфин "Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп.1. Спр.192.Л.113.

У ліпені 1944 г. горад Масты быў вызвалены. Пачалося адраджэнне, як прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці, транспарту, так і культурна-бытавых устаноў. Аднаўляліся пасля вайны і ўстановы, дзе працоўныя маглі адпачыць пасля цяжкага працоўнага дня – гэта клубы і бібліятэкі.



Бібліятэка аднавіла сваю работу ўжо ў 1946 годзе, на яе ўзнаўленне было затрачана 20 тысяч рублёў. Пад яе быў адведзены толькі адзін пакой без печы, таму ў памяшканні было заўсёды холадна. Не было сталоў і крэслаў для чытачоў, новую літаратуру не было куды складваць. Таму не дзіўна, што на 24 мая 1947 года раённая бібліятэка налічвала толькі 160 чытачоў. Каб выправіць сітуацыю, было вырашана адвесці пад бібліятэку яшчэ адзін пакой, які выкарыстоўваўся б, як чытальная зала і правесці яго рамонт.

З 1949 года раённую бібліятэку ўзначальвае ***Казакова Ганна Максімаўна***. Працуюць у бібліятэцы і два бібліятэкары – ***Ткачук Ганна Харламаўна*** і ***Конава Вера Іванаўна.*** Размяшчалася бібліятэка па адрасу: г.Масты, вул. Савецкая, д.29 у камунальным памяшканні, якое складалася з двух невялікіх пакойчыкаў. У чытальнай зале было 3 сталы, 5 крэслаў, 10 табурэтак і 3 стэлажы – адзін двухбаковы і два аднабаковыя, якія змяшчаліся ў кнігасховішчы.

Агульная плошча бібліятэкі складала 32 $м^2$, у тым ліку залы 22$м^2$. Фонд бібліятэкі на 1.01.1949 г. складаў – 2663 экз. За год бібліятэка атрымала 922 экз. літаратуры на суму 6697 руб. 80 кап., выбыла – 150 экз. Літаратура набывалася праз бібкалектар, кніжны магазін № 1 г.Гродна і мясцовы кніжны магазін. І ўжо на 1.01.1950 г. фонд бібліятэкі налічваў 3584 экз. дакументаў.

**1949 год**
**Чытачы - 1336**
**з іх чытачы чытальні - 118**
**з іх чытачы перасовак - 553**
**з іх дзяці - 481**
**Кнігавыдача - 14589**
**Наведванні - 12996**

***Кніжныя выставы - 24***
***Гучныя чытанні - 59***
***Літаратурны вечар - 1***
***Чытацкая канферэнцыя - 1***

Усе гэтыя лічбы гавораць аб тым, што раённая бібліятэка карысталася попытам: чытачы актыўна наведвалі бібліятэку (наведвальнасць складала амаль10 разоў).

На жаль, у бібліятэцы было холадна і сыра. Кнігі доўгі час не перапляталіся. Каталога на ўвесь фонд не было. Не хапала дзіцячай літаратуры.

Аднак нягледзячы на нялёгкія ўмовы першых пасляваенных гадоў бібліятэкарам працаваць было цікава, таму што людзі цягнуліся да ведаў, да кнігі. Чытачы актыўна ўдзельнічалі ў масавых мерапрыемствах. Працавала ў бібліятэцы 2 гурткі. Увогуле, мерапрыемствы, якія праводзіліся ў той час, аб'ядноўвалі шырокае кола чытачоў і былі прысвечаны розным палітычным кампаніям і падзеям грамадскага жыцця. І трэба зазначыць, што яны выклікалі вялікую цікавасць у чытачоў, бо нараджалі веру ў новае, лепшае жыццё.

Штогод выбіраўся актыў бібліятэкі, які складаўся з 10 чалавек: гэта былі ўрачы, настаўнікі, аграномы, работнікі райвыканкама, фанернага завода, лесазавода.

# 50-я гады

Істотныя змены ў бібліятэчнай справе адбыліся ў 50-ых гадах: развівалася сетка бібліятэк, паляпшаўся іх кніжны састаў, актывізавалася масавая работа. Раённая бібліятэка прымае актыўны ўдзел ва ўсіх падзеях палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Мастоўшчыны. У пачатку 50-х гадоў стаяла задача па завяршэнню калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Разам з работнікамі палітаддзелаў бібліятэкары развярнулі шырокую работу па папулярызацыі калектыўнай працы, чыталі лекцыі і даклады аб сацыялістычным ладзе жыцця.



У мэтах забеспячэння паспяховага правядзення ўборкі ўраджая і здачы дзяржаве хлеба бібліятэкары раённай бібліятэкі арганізоўвалі агравугалкі, афармлялі кніжныя вітрыны з літаратурай па сельскай гаспадарцы, праводзілі гучныя чытанні газет у палях, брыгадах, на фермах, арганізоўвалі выступленні мастацкай самадзейнасці, выступалі з дакладамі.

Праводзіліся "месячнікі кнігі", у якіх бібліятэка прымала непасрэдны удзел. Мэта "месячнікаў кнігі": арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання ў кожным населеным пункце раёна, прыцягненне ў бібліятэку чытачаў з кожнай сям'і. Дзеля гэтага выкарыстоўваліся розныя формы і метады масавай работы з чытачамі: арганізоўваліся кніжныя вітрыны, праводзіліся гучныя чытанні мастацкай літаратуры, чытацкія канферэнцыі. Бібліятэкары бралі кнігі з кіёска ў магазіне №9 мястэчка Зяльвяне для прадажы іх сялянам і арганізоўвалі кнiганошаўства ад раённай бібліятэкі. Кожны работнік бібліятэкі павінен быў прадаць літаратуры на 1000 руб.

Бібліятэкары складалі планы работы для аказання практычнай і метадычнай дапамогі сельскім бібліятэкам у апрацоўцы кніг, у арганізацыі масавай работы, афармленні фармуляраў чытачоў. Работнікі раённай бібліятэкі штомесячна выязджалі ў сельскія бібліятэкі на 3-5 дзён. За месяц складалася 6 актаў аб праверцы бібліятэк.

У сувязі з адкрыццём бібліятэкі ў вёсцы Кульшычы з раённай бібліятэкі было перадана 2 стала, 10 крэслаў, 1 шкаф, 700 экз. літаратуры, у тым жа годзе 300 экз. было перадана Белавічскаму сельскаму клубу.

У 1954 годзе згодна распараджэнню выканкама абласнога савета народных дэпутатаў у г.п. Масты быў адкрыты перасоўчы пункт раённай бібліятэкі. Першым яе загадчыкам стаў ***Верабей Юльян Максімавіч***. Перасоўкі былі арганізаваны ў калгасах, на МТС. Бібліятэка аказвала дапамогу ў вывучэнні кніг аб перадавым вопыце і новых дасягненнях ў вобласці навукі, тэхнікі, сельскай гаспадаркі.

У 1955 годзе па прычыне таго, што ў бібліятэцы мелася асобнае памяшканне для чытальнай залы, была ўведзена пасада загадчыка чытальнай залы. Першым загадчыкам чытальнай залы раённай бібліятэкі стала ***Бядуліна Алена Аляксандраўна***.

Актыўны ўдзел бібліятэкары раённай бібліятэкі прымалі ў добраўпарадкаванні і азеляненні. У сувязі з гэтым у 1953-1954 г. было пасаджана 30 дрэў вакол участка бібліятэкі.

У 50-я гады кіравалі раённай бібліятэкай: ***А.Ф.Іванова***, ***А.Р.Грамыка***, ***А.І.Базарскі***, ***Л.А.Кукушкіна***, ***А.К.Рудзь***. Усе яны ўнеслі пэўны ўклад у развіццё бібліятэчнай справы на Мастоўшчыне ў 50-я гады.

# 60-я гады

Значны ўклад у прывабліванні чытачоў, прапагандзе кнігі, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы зрабіла ***Плыткевіч Алена Яўсееўна***, якая з 1959 да 1967 года з'яўлялася загадчыцай Мастоўскай раённай бібліятэкі. У 60-ыя гады ў бібліятэцы таксама працавалі такія бібліятэкары, як ***М.Н.Марчанка***, ***В.М.Чыкіндзіна***, ***А.Я.Гурская***, ***Т.П.Літоўская***, ***Н.Р.Прэдка***, ***І.С.Мятлюк***.

Мастоўская раённая бібліятэка знаходзілася па адрасу г. Масты, вул. Савецкая, д.31. У 1961 годзе бібліятэка атрымала ганаровае званне – "Бібліятэка выдатнай працы".

На падставе закона 1962 года "Об укреплении связи школы с жизнью" была арганізавана вытворчая практыка па падрыхтоўцы бібліятэкараў на базе 9-х класаў. Выкладчыкамі вытворчай практыкі былі накіраваны ад аддзела культуры загадчыца раённай бібліятэкі Плыткевіч А.Я. і загадчыца чытальнай залы ***Катkоўская Е.В.***

У 1967 годзе, да 50-годдзя ўстанаўлення Савецкай улады бібліятэкі раёна правялі эстафету па 2-х маршрутах. Пры перадачы эстафеты праводзіліся масавыя мерапрыемствы, мэтай якіх было фарміраванне камуністычнага светапогляду насельніцтва.

У 1968 годзе да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі ў бібліятэцы вялася масава-палітычная работа з насельніцтвам, аформлена адпаведная наглядная агітацыя, прысвечаная юбілею рэспублікі. Рэгулярна чыталіся лекцыі і даклады на розныя тэмы, арганізоўваліся вечары сустрэч з героямі і знакамітымі працаўнікамі, тэматычныя, літаратурныя вечары, кніжныя вечары, дыспуты, праводзіліся канферэнцыі чытачоў. Надавалася ўвага па паляпшэнню бібліятэчнага абслугоўвання жыхароў горада і вёскі.

У дапамогу вытворчасці ад бібліятэкі працавала 15 перасовак – 11 ў горадзе, 4 ў вёсцы. Перасоўчыя бібліятэкі ставілі перад сабой задачу: давесці да чытача палітычную, сельскагаспадарчую кнігу і дасягалі поспехаў.

У 60-ыя гады паспяхова працавалі перасоўкі ад раённай бібліятэкі ў калгасе імя Калініна, (в.Забалаць), калгасе імя Леніна (в.Вайнілавічы).



***Бібліятэка на вул. Савецкай д. 31***

Працяглы час загадчыцай перасоўчага фонду раённай бібліятэкі працавала ***Гарнак Лідзія Сцяпанаўна*** – ініцыятыўны працаўнік, якая валодала дзелавымі якасцямі, карысталася аўтарытэтам сярод чытачоў і работнікаў бібліятэкі. За добрасумленную працу Лідзія Сцяпанаўна неаднаразова ўзнагароджвалася ганаровымі граматамі раённага выканаўчага камітэту.

Кожны год фонд раённай бібліятэкай папаўняўся разнастайнай літаратурай. Раённая бібліятэка ў падарунак атрымала ад Гродзенскага аблкнігаторга 3698 экз. кніг на суму 27632 руб. У 1967 годзе выйшаў загад аб замацаванні кніжнага фонда за ўсімі аддзеламі бібліятэкі: абанементам, чытальнай залай, перасоўчым фондам.

**1969 год**
**Чытачы - 2193**
**Кнігавыдача - 28192**
**Кніжны фонд - 28596**

# Бібліятэка 60-х - гэта мы!!!















# 70-я гады

Працягвалася работа па павышэнню эфектыўнасці бібліятэчна-бібліяграфічнай працы ў раённай бібліятэцы, удасканаленню форм і метадаў прапаганды кнігі, паглыбленню кіраўніцтва чытаннем і самаадукацыяй чытачоў, з выкарыстаннем новых метадаў абслугоўвання кнігай.

У 1970 годзе загадчыцай бібліятэкі была назначана малады спецыяліст з вышэйшай адукацыяй – ***Кожына Марыя Дзмітрыеўна***, якая працавала на гэтай пасадзе да 1973 года. Граматны спецыяліст, Марыя Дзмітрыеўна арганізавала работу з моладдзю па ваенна-патрыятычнаму выхаванню.

Актыўны ўдзел прынялі ў рабоце навукова-практычнай канферэнцыіі “Заветам Леніна верны” работнікі біблятэкі ***Т.К.Лішык, Л.В.Панова, К.В.Дзейкала, А.Я.Гурская.***

Значную работу па распаўсюджванню кнігі сярод чытачоў праводзілі работнікі раённай бібліятэкі ў 1974 годзе, якую ў гэты час ўзначальвае ***Марыя Аляксандраўна Шчука.***

Кніжны фонд бібліятэкі ў той час налічваў 35500 экзэмпляраў мастацкай, тэхнічнай, палітычнай і інш. літаратуры. Паслугамі бібліятэкі карысталіся 1807 чытачоў. Кожны месяц кніжны фонд бібліятэк раёна папаўняўся навінкамі мастацкай, палітычнай, навуковай, сельскагаспадарчай і тэхнічнай літаратуры. Толькі ў 1974 годзе для паслуг чытачоў раённай бібліятэкі  паступіла каля 200 кніг.

У 1974 годзе бібліятэка пераехала ў будынак былой гасцініцы па адрасу 30 год УЛКСМ д.7. Раённым аддзелам культуры для набыцця новага абсталявання было выдзелена 500 руб.



У 1976 годзе ў раённай бібліятэцы было аформлена нямала тэматычных кніжных выстаў і паліц, на якіх была шырока прадстаўлена літаратура, прысвечаная важнейшым гістарычным падзеям і творчай дзейнасці асобных пісьменнікаў. Сярод іх вылучаюцца выставы аб жыцці і творчай дзейнасці вядомага рускага класіка А.П.Чэхава, чыё імя ў той час насіла наша  бібліятэка. Нямала цікавай і разнастайнай літаратуры знаходзілася і на тэматычных выставах, прысвечаных Дню абвяшчэння Сацыялістычнай Федэратыўнай рэспублікі Югаславіі і лаурэатам Дзяржаўных і Ленінскіх прэмій апошніх гадоў. Вялікім попытам у наведвальнікаў бібліятэкі карыстаюцца кнігі з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў, якія ў свой час наведвалі наш раён. Адна з такіх кніг – зборнік выбраных твораў паэта-песенніка Адама Русака, дзе аўтар напісаў наступныя словы: *”Паважаным чытачам Мастоўскай бібліятэкі, А.Русак”.*  Свае творы з аўтографамі чытачам падарылі Давід Сімановіч, Алесь Махнач, Аляксей Карпюк, Макар Паслядовіч, Анатоль Астрэйка і іншыя.

У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС “О повышении роли библиотек в коммунистическом воспитании трудящихся и научно-техническом прогрессе” (май 1974) і згодна плана пераводу бібліятэк на новую форму працы, зацверджанаму Міністэрствам культуры БССР, згодна рашэнню Мастоўскага райвыканкама прыказ за №21 ад 24 жніўня – 1 красавіка 1978 года была праведзена цэнтралізацыя бібліятэк Мастоўскага раёна і арганізавана ЦБС. Раённая бібліятэка стала з’яўляцца каардынацыйным цэнтрам для 50 бібліятэк Мастоўшчыны. У 1978 годзе былі створаныя 3 аддзелы: аддзел камплектання і апрацоўкі літаратуры, методыка-бібліяграфічны аддзел і аддзел абслугоўвання.



Мятлюк Ірына Сцяпанаўна

З 1978 года пачынаецца новая старонка ў гісторыі бібліятэкі, на пасаду дырэктара Мастоўскай ЦБС прызначаецца ***Мятлюк Ірына Сцяпанаўна***. З яе прыходам, а яна выконвала абавязкі дырэктара з 1978 па 1995 гг., звязаны цэлы этап у развіцці бібліятэчнай працы ў раёне. Ірына Сцяпанаўна праявіла сябе творчым чалавекам, любіла сваю справу, умела арганізаваць працу бібліятэкараў па ажыццяўленню новаўвядзенняў.

Гэта быў час рэарганізацыі і аптымізацыі сеткі – эпоха цэнтралізацыі і ўкаранення ў практыку работы бібліятэкі бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі кніжнага фонда. У абслугоўванні чытачоў шырока выкарыстоўваліся такія формы: як брыгадны абанемент, сістэма выбарчага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ).

З’яўленнем таго часу стала арганізацыя адкрытага доступа да фондаў, што мы сёння называем даступнасцю інфармацыі. Пачалася аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў: з’явіўся сродак капіравання і аператыўнага распаўсюджвання дакументаў – ратапар, пішучыя машынкі; апарат для пошука і чытання інфармацыі на мікрафішах. Укаранялася метадалогія, методыка нарміравання працы.

Актыўны ўдзел работнікі бібліятэкі прынялі ў правядзенні Усесаюзнай маладзёжнай чытацкай канферэнцыі “Огненные годы”, афармляліся кніжныя выставы і тэматычныя паліцы, праводзіліся чытацкія канферэнцыі і абмеркаванні кніг: Шашкоў В. “Спытай сваё сэрдца”, Верхась В., Гарэлін “Гэта было ў Скідзеле”, Шупеня С. “Гневная Щара”.

Вялікую ўвагу цэнтральная бібліятэка звяртала на прапаганду матэрыялаў і рашэнняў 25 з’езда КПСС, 28 з’езда КПБ, на сустрэчу 60-годдзя БССР і КПБ. У ЦБ афармляліся кніжныя выставы, праводзіліся агляды новай літаратуры, дні інфармавання і г.д.

У 70-ыя гады сваю працоўную дзейнасць пачалі ***З.Л.Кайрыс, С.У.Дашук, Т.У.Кулікоўская, Н.У.Ляскевіч, Т.У.Валчкевіч, Н.М.Войнава, Г.С.Пяцэвіч, М.Ф.Рында, Т.К.Куршук, І.В.Курылко, Т.А.Цюхно, В.І.Бакун, Т.У.Цяслёнак, А.Б.Кулеш, М.В.Хандогая.***

**1979 год**
**Чытачы - 3300**
**Кнігавыдача - 71280**
**Кніжны фонд - 44462**

# Бібліятэка 70-х - гэта мы!!!





Супрацоўнікі раённай бібліятэкі: Зубко Т.У., Курылка І.М.,
Мятлюк І.С.,Войнава Н.М., Кайрыс З.Л.



Бібліятэкары Зубко Т.У., Кайрыс З.І. знаёмяцца з навінкамі літаратуры



Нарада пры дырэктару

# 80-я гады

У першай палове 80-ых гадоў работа цэнтральнай бібліятэкі была накіравана на прапаганду матэрыялаў і рашэнняў з’ездаў КПСС і КПБ, прапаганду твораў У.І.Леніна і літаратуры аб яго жыцці і дзейнасці, належную сустрэчу 60-годдзя ўтварэння СССР, 40-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне і 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прапаганду рашэнняў Прадуктовай праграмы, прапаганду літаратуры да 100-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы і Я. Коласа, антыалкагольную прапаганду. Работнікі працавалі над выкананнем узятых сацабавязкаў.

Вядома, што доўгі час раённая бібліятэка не мела пастаяннага і зручнага памяшкання. Доўгія гады яна знаходзілася ў розных месцах. Па ініцыятыве старшыні Мастоўскага райвыканкама Вашко Уладзіміра Іванавіча ў 1983 годзе была пабудавана новая тыпавая бібліятэка.

У пачатку 1984 года цэнтральная бібліятэка пачала сваю работу ў новым памяшканні па адрасу вуліца Савецкая, дом 19а, дзе яна знаходзіцца да цяперашняга часу.







Па ўспамінах бібліятэкара Кайрыс Зінаіды Леанідаўны супрацоўнікі бібліятэкі з вялікім энтузіязмам пакавалі, насілі, грузілі бібліятэчны фонд, каталогі і іншую маёмасць, уладкоўваючыся ў новым будынку.

Новай формай работы цэнтральнай бібліятэкі стала літаратурна-музычная гасцёўня “Натхненне”, якая была створана сумесна з РДК, школай мастацтваў, клубам “40 гадоў БССР”. У бібліятэцы з’явіліся дадатковыя функцыі. Цяпер бібліятэка – гэта не толькі кнігі, фармуляры і строгая цішыня чытальнай залы, а гэта яшчэ і свята для аматараў слова і музыкі, радасць творчых зносін блізкіх па духу людзей.







У 1984 годзе прайшлі першыя пасяджэнні гасцёўні. Доўгі час вядучай была выкладчыца школы мастацтваў Барташ Надзея Мікалаеўна. Пазней яе замянілі Падгайская Галіна Ўладзіміраўна (рэжысёр РДК) і Ганчар Галіна Сяргееўна.(загадчыца аддзела абслугоўвання ЦБ).




Аднымі з першых былі падрыхтаваны і праведзены наступныя пасяджэнні:

- “Мастацтва і спорт”;
- “Не для славы, не для награды, а на благо родной земли” (да 30-годдзя асваення цаліны);
- “А музы не молчали” (да 40-годдзя Вялікай Перамогі).

Асаблівай папулярнасцю сталі карыстацца такія формы масавай работы, як вечарыны паэзіі і музыкі, творчыя сустрэчы, прэзентацыі творчасці гродзенскіх паэтаў і мясцовых аўтараў.

У **1985** годзе цікава прайшло пасяджэнне гасцёўні “Літаратурная Мастоўшчына”, дзе адбылася сустрэча з паэтамі горада і раёна, запомнілася сустрэча з работнікамі культуры горада Гродна на пасяджэнні гасцёўні “Ад шчырага сэрца”.

Паступова наладжвалася даведачная і інфармацыйная работа. Першым бібліёграфам ЦБ стала Рында Марыя Фаўстаўна.

У **1985** годзе была завершана работа па пераводу каталогаў і картатэк на ББК. Цэнтральная бібліятэка выкарыстоўвала для прапаганды кнігі мясцовы друк і радыё, вяла даведачна–інфармацыйнае абслугоўванне мерапрыемстваў райвыканкама. Інфармацыю аб новых кнігах атрымлівалі **18** працоўных калектываў раёна, індывідуальным інфармаваннем карысталіся **14** абанентаў. З **1980** па **1985** год цэнтральнай бібліятэкай было праведзена **251** масавае мерапрыемства.

У **1986** годзе была створана літаратурна–прапагандысцкая група (ЛПГ), якая папулярызавала літаратуру ў працоўных калектывах, па месцы жыхарства. Раз ў **2** месяцы ЛПГ праводзілі мерапрыемствы ў калектыве раённай бальніцы, такія як ”Там сердце моё, где моя Родина” (аб жыцці і творчасці Ф.Шапэна) і “Поэтическое сердце России” (аб жыцці і творчасці С.Ясеніна); у інтэрнаце МПМК-**155** і Доме быта праведзена мерапрыемства “Во вред здоровью, семье, обществу”, на якой выступалі ўрач-нарколаг Г.Собаль, інспектар па справах непаўналетніх В.Мандзік; у СШ №**1** праведзены тэматычны вечар “Солдаты порядка”, на якім выступілі супрацоўнікі крымінальнага вышуку М.Поклад і ўчастковы інспектар П.Кандраценка, таксама праведзена чытацкая канферэнцыя з супрацоунікамі міліцыі па кнізе “Печальный детектив” У. Астаф’ева.

Выконваючы пастанову аб укараненні платных паслуг насельніцтву пры цэнтральнай бібліятэцы быў арганізаваны гурток па вязанню “Спіца”, платныя курсы па вывучэнню польскай мовы, у **1988** годзе ЦБ атрымала **145** руб. за выкананне платных паслуг.

Не страціла сваю папулярнасць сярод жыхароў горада літаратурна-музычная гасцёўня “Натхненне”. З **1986** па **1990** год прайшло **16** пасяджэнняў, асабліва цікавымі для чытачоў сталі: “Наш город в звуках и красках”, “Женщины революции”, “А.Мицкевич – великий певец народа”, ”Тебя, как первую любовь, России сердце не забудет”(да **190**-годдзя з дня нараджэння А.С.Пушкіна), сустрэча з беларускімі пісьменнікамі І.Філімонавай, Я.Радкевіч.

З мэтай падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у бібліятэчнай сістэме пры вучэбна-вытворчым камбінаце ў **1988** годзе быў адчынены бібліятэчны факультэт з **2**-х гадзічным тэрмінам навучання.

**1989 год**
**Чытачы - 3830**
**Кнігавыдача - 76690**
**Кніжны фонд - 64134**
**Штат бібліятэкі налічвае 14 чалавек**

У **80**-ыя гады сваю працоўную дзейнасць у цэнтральнай бібліятэцы пачалі: ***Г.С.Ганчар, В.Ю.Буцько, М.М.Карніенка, М.Р.Кадач, Т.М.Якусік, Н.Д.Наваградская, Л.І.Пакацiла, С.І.Чайкіна.***

# Бібліятэка 80-х - гэта мы!!!

















# 90-я гады

Змены, якія праходзілі ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі ў 90-х гадах сталі сур'ёзным выпрабаваннем для ўсіх бібліятэк. З адказам ад ідэалагічнай функцыі яны страцілі кропку апоры. Сітуацыя ўскладнілася з падзеннем прэстыжу бібліятэк у грамадстве. У гэты перыяд трэба было шукаць новыя шляхі і сродкі зрабіць бібліятэку прывабнай для чытачоў.

Галоўнай задачай работы цэнтральнай бібліятэкі ў гэты перыяд стала адраджэнне нацыянальнай культуры, гісторыі, літаратуры і мовы, прапаганда беларускага мастацтва. Бібліятэкары карыстаюцца роднай мовай пры абслугоўванні чытачоў, справаводстве, масавых мерапрыемствах. Адраджэнню і развіццю духоўнай нацыянальнай культуры садзейнічаюць правядзенне беларускіх святаў і абрадаў. Упершыню правялі свята "Масленіца" і " Гуканне вясны" работнікі цэнтральнай бібліятэкі ў 1993 годзе.

У 1995 годзе адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні прысвечанай 5-ай гадавіне прыняцця "Закона аб мовах". На пасяджэнні гасцёўні сабраліся людзі рознага ўзросту і прафесій. Аб сучасным стане беларускай мовы, ужытку яе ў розным асяроддзі, аб укладзе ўстаноў культуры ў справу адраджэння роднай мовы, аб удзеле школ раёна ў захаванні матчынай мовы разважалі намеснік рэдактара раённай газеты А.С.Сабасцян, загадчык аддзела культуры М.А.Храпко, інспектар аддзела адукацыі Д.А.Аўтуховіч. На пасяджэнні гасцёўні выступаў ансамбль "Прынямонка". У выкананні калектыву гучалі беларускія народныя песні.



У час правядзення пасяджэнняў гасцёўні





Да дня Вялікай Перамогі і 55-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў цэнтральнай бібліятэкай была арганізавана сустрэча вучняў горада з ветэранамі вайны Г.А.Бакштаевым і М.Ф.Федчыкам у літаратурна-музычнай гасцёўне, якую назвалі “Я родам не з дзяцінства – з вайны”.

Да Дня пажылога чалавека праведзена гасцёўня “Тепло наших сердец – вашим прожитым годам”, на якой былі ўшанаваны ўдзельнікі хора ветэранаў вайны і працы. Для іх спяваў жаночы вакальны ансамбль “Эцюд”. У 90-я гады было падрыхтавана і праведзена 45 пасяджэнняў гасцёўні “Натхненне”.

У канцы 90-х гадоў галоўная бібліятэка раёна стала прывабным месцам для правядзення вольнага часу гараджан. Яна ўносіла значны ўклад у выхаванне моладзі і падрастаючага пакалення.



Бібліятэцы заўсёды шанцавала на таленавітых кіраўнікоў. На гэты раз у 1995 годзе яе ўзначаліла ***Валчкевіч Таццяна Уладзіміраўна*** – мэтанакіраваны, творчы чалавек, энтузіяст бібліятэчнай справы. Да гэтага часу Таццяна Уладзіміраўна працавала ў метадычным аддзеле ЦБ. У яе была магчымасць не толькі вывучыць запыты чытачоў, аказваць метадычную дапамогу сельскім бібліятэкарам, удасканаліць свае арганізатарскія здольнасці, але і стаць прафесіяналам бібліятэчнай справы. Узначаліўшы бібліятэку, Таццяна Уладзіміраўна ўклала ў работу ўвесь свой талент сталага кіраўніка і гаспадыні, пераўтварыўшы бібліятэку ў сапраўдны, велічны Храм культуры.

У калектыве бібліятэкі ведаюць, што дырэктар – чалавек дэмакратычны і да яе можна зайсці са сваёй справай і бібліятэкару, і тэхнічнаму работніку, і чытачу. Усіх яна выслухае, калі трэба – падтрымае і дапаможа.

Больш за 30 гадоў Таццяна Уладзіміраўна рабіла ўсё магчымае, каб добрая кніга абагачала сэрца, была надзейным спадарожнікам у жыцці. Пачаўшы ў 1975 годзе працаваць ў Струбніцкай сельскай бібліятэцы, яна прайшла ўсе ўчасткі бібліятэчнай работы і ведае пра яе не па чутках.

Неаднаразова Валчкевіч Таццяна Уладзіміраўна атрымлівала Ганаровыя Граматы ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, Гродзенскага абкама прафсаюза і аддзела культуры Мастоўскага райвыканкама, ўзнагароджана ганаровым знакам Беларускага рэспубліканскага прафсаюза работнікаў культуры.



Калектыў цэнтральнай і раённай дзіцячай бібліятэк (1999)

**1999 год**
**Чытачы - 4345**
**Кнігавыдача - 83800**
**Кніжны фонд - 85180**
**Штат бібліятэкі налічвае 14 чалавек**



У сакавіку 1999 года, на базе

Мастоўскай цэнтральнай бібліятэкі, быў праведзены 2-х дзённы абласны семінар “Улік бібліятэчных фондаў у ЦБС. Вядзенне дакументацыі”. На семінары прысутнічалі загадчыкі аддзелаў адзінага фонду Гродзенскай ЦБС, спецыялісты Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У канцы семінара было праведзена пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Натхненне”, пад назвай “Лампада чистой любви. Женщины в жизни А.С.Пушкина”.





У канцы 90-х гадоў трывала ўвайшлі ў практыку работы бібліятэкі платныя паслугі. Першыя крокі ў гэтым накірунку зрабіла цэнтральная бібліятэка ў 1999 годзе. Гэтаму новаўвядзенню, папярэднічала вялікая праца. Вельмі важна было не страціць нашых пастаянных чытачоў, а наадварот укараніць такія паслугі, якія дапамаглі б прыцягнуць у бібліятэку новых карыстальнікаў. Першай платнай паслугай стала выдача кніг і перыядычных выданняў з чытальнай залы на ноч, у выхадныя і святочныя дні. Планавыя паказчыкі на платныя паслугі спачатку не даводзіліся.

Работнікі цэнтральнай бібліятэкі знаходзіліся ў пастаянным пошуку – чым здзівіць, а значыць і прыцягнуць у бібліятэкі чытачоў? У 2000 годзе, за заробленыя грошы быў створаны камерцыйны фонд на абанеменце цэнтральнай бібліятэкі. Пачыналі з 22 кніг. У 2002 годзе, акрамя традыцыйных бібліятэчных, была ўведзена такая платная паслуга як ксеракапіраванне.

У 2002 годзе, за сродкі са спецрахунку была набыта ліцэнзія на пракат відэакасет. Але прагрэс не стаіць на месцы, і ў жыхароў раёна з’явіліся DVD-прайгравальнікі, камп’ютары, таму касеты сталі карыстацца меншым попытам. У сувязі з гэтым была распрацавана новая паслуга “Пракат DVD-дыскаў”, якая была ўведзена ў кастрычніку 2006 года.

Чытачы атрымалі магчымасць узяць у бібліятэцы не толькі кнігі, але і відэакасеты, DVD-дыскі. У сувязі з гэтым у бібліятэцы з’явіліся новыя карыстальнікі, якія ніколі не чыталі ў бібліятэцы. Першы план на платныя паслугі, які быў даведзены цэнтральнай бібліятэцы ў 2002 годзе склаў 1,0 млн.руб., але на наступны год (2003) назіраўся рэзкі скачок у павышэнні плана – 7470,9 млн.руб. У 2014 годзе план складае – 90715,0 млн.руб.

У 90-я гады сваю працоўную дзейнасць у цэнтральнай бібліятэцы пачалі: ***М.В.Юроўская, В.А.Коршун, Т.І.Стэльмах, І.М.Цыбуль, Л.А.Засценчык, А.М.Даўгун, Т.З.Ярашук.***

## Бібліятэка 90-х - гэта мы!!!









## 2000-я гады

У пачатку 21 стагоддзя, як і ў мінулыя гады, асноўнымі напрамкамі дзейнасці бібліятэкі ў рабоце з чытачамі заставаліся: прапаганда беларускай кнігі і краязнаўства, здаровага ладу жыцця, работа з сям'ёй, школай, сацыяльна неабароненымі групамі насельніцтва. Супрацоўнікі бібліятэкі імкнуліся ў сваёй дзейнасці задаволіць запыты і патрэбы чытачоў, стварыць спрыяльныя ўмовы для адукацыі, самавыхавання, станаўлення светапоглядаў, правядзення вольнага часу, мэтанакіравана працавалі над пошукам больш эфектыўных, дасканальных форм і метадаў работы з чытачамі і прапаганды кнігі.

Важным напрамкам дзейнасці Мастоўскай ЦБС становіцца фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў і ўкараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій, актыўна выкарыстоўваюцца ў рабоце бібліятэкі магчымасці камп'ютарнай тэхнікі.




Першы камп'ютар быў набыты ў 2003 годзе, а ў 2014 годзе камп'ютарны парк цэнтральнай бібліятэкі налічвае 14 машын. Былі набыты праграмы: «Рэгістрацыя чытачоў", "Абслугоўванне чытачоў", "Камплектаванне і апрацоўка», «Аналітыка», якія дазволілі ў поўным аб'ёме аўтаматызаваць усе бібліятэчныя працэсы працы цэнтральнай бібліятэкі. Усе камп'ютары цэнтральнай бібліятэкі былі аб'яднаны ў лакальную сетку.

З мэтай забеспячэння адкрытага доступу карыстальнікаў да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк раёна ў 2002 годзе пачалася работа па стварэнню электроннага каталога. У 2010 годзе пры чытальнай зале цэнтральнай бібліятэкі быў адкрыты камп'ютарны клас. Адным з першых у вобласці быў створаны Web-сайт цэнтральнай бібліятэкі.

Пераход на новыя тэхналогіі дазволіў палепшыць афармленне бібліятэк, актывізаваць выдавецкую дзейнасць, палегчыць працу па індывідуальнаму інфармаванню абанентаў, таксама даць чытачам шэраг дадатковых платных паслуг.

З кожным годам усё больш карыстаюцца попытам і паслугі, якія аказвае насельніцтву Публічны цэнтр прававой інфармацыі (ПЦПІ), які створаны і дзейнічае пры цэнтральнай бібліятэцы з 2003 года. З дапамогай ПЦПІ былі створаны ўсе ўмовы для поўнага, дакладнага і аператыўнага забеспячэння чытачоў інфармацыяй ў галіне права. Вядзецца работа з праграмай Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі РБ "Эталон WIN", у якім змешчана паўнатэкставая база дадзеных прававой інфармацыі.

У адпаведнасці з "Палажэннем аб Публічным цэнтры прававой інфармацыі Гродзенскай вобласці", з мэтай аказання бясплатнай юрыдычнай дапамогі насельніцтву, паміж цэнтральнай бібліятэкай і юрыдычнай кансультацыяй Мастоўскага раёна заключаны дагавор ў верасні 2003 года "Об организации бесплатных консультаций и проведении приемов юридического характера для пользователей ПЦПИ". Са снежня 2004 года бясплатныя кансультацыі насельніцтву ў ПЦПІ аказвае суддзя, а ў пачатку 2005 года аналагічны дагавор быў заключаны і з натарыяльнай канторай.

Чытачы Мастоўскай ЦБС сталі мець магчымасць 1 раз у месяц атрымліваць бясплатныя кансультацыі па прававых пытаннях наступных спецыялістаў:

- кожную 1-ю сераду месяца - юрыст;
- кожную 2-ю сераду месяца - натарыус,
- кожную 3-ю сераду месяца - суддзя.





З мэтай сістэматычнага абслугоўвання літаратурай насельніцтва раёна, якое пражывае ў вёсках, аддаленых ад стацыянарных бібліятэк, улічваючы ўзроставыя, прафесійныя, агульнаадукацыйныя і іншыя асаблівасці ў лістападзе **2007** года пры Мастоўскай цэнтральнай бібліятэцы пачала дзейнічаць перасоўная бібліятэка (бібліобус).







Быў набыты і абсталяваны аўтобус; распрацавана і зацверджана ў райвыканкаме Палажэнне аб перасоўнай бібліятэцы (бібліобусе); сфарміраваны кніжны фонд бібліобуса; распрацаваны **9** маршрутаў па аддаленных вёсках і ахоплены практычна ўвесь раён. Да сваіх чытачоў перасоўная бібліятэка выязджае два разы на тыдзень - сераду і чацвер. Штомесячна складаецца графік выездаў бібліобуса.

Для чытачоў бібліобуса частка кніг была перададзена з фондаў цэнтральнай бібліятэкі, таксама набывалася новая літаратура. На **1.01.14** фонд кніг бібліобуса складае -**2006** экз.

Аформлена падпіска на перыядычныя выданні, якія карыстаюцца попытам у чытачоў раёна. Сярод іх такія выданні, як часопісы “Алеся”, “Вожык”, “Хозяин”, “Ксюша”, “Народны доктар”, “Женский журнал”.

Паслугі бібліобуса карыстаюцца попытам сярод жыхароў раёна. Чытачы аддаленых вёсак на старонках раённай газеты “Зара над Нёманам” выказвалі словы ўдзячнасці бібліятэкарам за прадстаўленую ім магчымасць чытаць любімыя кнігі і часопісы.


Факт нашей жизни

Без книг мы не остались

Факт нашей жизни

К вам приедет библиотека

Весной и осенью, зимой и летом бежит по Мостовщине автобус. Бежит, торопится, а едут в нем необычные пассажиры. Прохожие невольно оборачиваются вслед ему и улыбаются, читая удивительное название «Библиобус».

“Калі надакучыць глядзець серыялы – чытаю кнігі”

Читатель благодарит

БИБЛИОТЕКА НА КОЛЁСАХ В ДЕРЕВНЕ

У нас, на Мостовщине

Книги с доставкой на дом

У нас, на Мостовщине

БИБЛИОБУС ПРИЕХАЛ!

Факт нашага жыцця

НЕ МЫ Ў БІБЛІЯТЭКУ, БІБЛІЯТЭКА ДА НАС!

**Бібліобус ў 2014 годзе**
**Чытачы - 770**
**Кнігавыдача - 10500**
**Зроблена выездаў - 80**
**Распрацавана маршрутаў - 9**
**Населеных пунктаў - 37**

Ужо 5 гадоў, з 2009 года цеснае супрацоўніцтва звязвае цэнтральную бібліятэку з раённым аб’яднаннем інвалідаў па зроку, праведзены мерапрыемствы:

- ► “Все мы – его ученики”, прэзентацыя кнігі В.К.Радыёнава;
- ► “Под сенью мудрости”, пасяджэнне гасцёўні;
- ► “Мы будем вечно прославлять, ту женщину, чьё имя – мать”, вечарына
- ► “За все тебя благодарю”, прэзентацыя паэтычнага зборніка.











Інавацыйная дзейнасць - гэта вядучы напрамак работы цэнтральнай бібліятэкі ў новым стагоддзі, якая мае сваёй мэтай пошук, ацэнку, распрацоўку і прымяненне бібліятэчных навін. Адным з інавацыйных навін 2007 года з'яўляецца стварэнне медыятэкі. Медыятэка зрабіла даступнымі ўсе віды сучасных крыніц інфармацыі для выканання запытаў карыстальнікаў. Яна ўключае папяровыя рэсурсы (кнігі, перыёдыку, каталогі) і рэсурсы на CD-дысках.

2012 год быў аб'яўлены ў Рэспубліцы Беларусь – **Годам кнігі.** Уся работа бібліятэкі была накіравана на папулярызацыю беларускай кнігі сярод насельніцтва горада, выхаванне духоўна-багатай асобы, далучэнне да кнігі, заахвочанне да чытання, развіццё творчай актыўнасці, здольнасцей, знаёмства з лепшымі творамі мастацкай літаратуры. Бібліятэка прыняла ўдзел у абласным конкурсе “Чытаем беларускую кнігу”.

28 верасня 2012 года супрацоўнікі бібліятэкі і самыя актыўныя чытачы сабраліся разам у цэнтральнай бібліятэцы на свята **“Яе вялікасць Кніга”**, каб выказаць словы вялікай павагі да добрай сяброўкі і дарадчыцы – беларускай кніге, старажытнай і сучаснай, беларускім асветнікам і першадрукарам, а таксама словы падзякі ўсім, хто любіць чытаць.

У фае бібліятэкі размясцілася выстава творчых работ удзельнікаў раённага конкурсу **“Кніга ў тваім жыцці”**, які завяршыўся 1 верасня. На суд журы былі прадстаўлены літаратурныя, паэтычныя і творчыя работы ў наступных відах дэкаратыўнага мастацтва: жывапіс, малюнак, графіка, скульптура, бацік, разьба, вырабы з прыроднаму матэрыялу. На выставе было размешчана 50 работ. Пасля знаёмства з выставай вядучыя ў нацыянальных касцюмах запрасілі ўдзельнікаў свята ў літаратурна-музычную гасцёўню. На свята былі запрошаны паэты з Гродна – Л.Кебіч, А.Нікіпорчык, Б.Ермашкевіч, якія чыталі свае вершы, раздавалі аўтографы.










Унікальны міні-музей «Свет дакамп'ютарнай тэхнікі» адкрыўся ў цэнтральнай бібліятэцы ў красавіку 2013 года. У ім прадстаўлены ўзоры тэхнічных сродкаў, якія выкарыстоўваліся ў паўсядзённым жыцці і працы ў ХХ стагоддзі. Тут прадстаўлены такія тэхнічныя сродкі як ратапрынт – своеасаблівы прататып сучаснага ксеракса, вялікая вылічальная машына "Искра", якая ў некалькі разоў перавышае размеры яе сучаснага аналага – калькулятара, радыёла, катушачны стэрэафанічны магнітафон, дыафільмапраектар... Выстава цікавая і для дарослых, і для дзяцей. Супрацоўнікі бібліятэкі праводзяць экскурсіі па экспазіцыі міні-музея.







Актыўна працуе бібліятэка па **"Праграме супрацоўніцтва Міністэрства культуры РБ і Беларускай Праваслаўнай царквы"**. У рабоце выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці па выхаванню духоўна-маральных каштоўнасцей у сваіх чытачоў праз разнастайныя формы і метады бібліятэчнай работы.

У жніўні (2013г.) ў горадзе Масты праходзіў **фестываль праваслаўнай культуры "Кладезь"**. У цэнтральнай бібліятэцы адбылася сустрэча з аўтарам кнігі "Православные святыни Беларуси" Наталляй Шчарбаковай. Сустрэча праходзіла з відэа-прэзентацыяй "Новамучанікі. Праваслаўны каляндар" на жнівень – верасень.

У рамках фестывалю з работнікамі цэнтральнай бібліятэкі і чытачамі, паслушніца Свята-Елісавецінскага манастыра, рэжысёр фестывалю праваслаўнай культуры сястра Галіна Карюкіна правяла гутарку пад назвай "Талент і сэнс жыцця".





У лістападзе 2014 года ў рамках праваслаўнай выставы-кірмашу «Радасць Слова», адбылася сустрэча юных чытачоў бібліятэкі з таленавітай пісьменніцай, аўтарам кніг для дзяцей, галоўным рэдактарам духоўна-асветніцкай газеты "Воскресенье" **Аленай Міхаленка**. Пісьменніца пазнаёміла дзяцей са сваімі кнігамі, у яе выкананні прагучалі вершы, урыўкі з твораў пра дабрыню і міласэрнасць. Удзельнікі мерапрыемства таксама паслухалі песні на вершы аўтаркі. Сустрэча юных чытачоў з Аленай Міхаленка атрымалася цікавай і пазнавальнай.





Супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі 25 сакавіка 2014 г. былі запрошаны на школу вучобы сацыяльных работнікаў, якая адбылася ў зале пасяджэнняў райвыканкама. Бібліятэкары прапанавалі сацыяльным работнікам два бібліяграфічных агляда: "Беларуская жаночая проза" і "Час чытаць часопісы". Прысутныя пазнаёміліся з аўтарамі і адметнымі рысамі, якія вызначаюць беларускую жаночую прозу. Цікавасць у слухачоў выклікалі новыя нумары жаночых часопісаў.







У 2000-я гады сярод бібліятэк вобласці стала добрай традыцыяй праводзіць обменныя вучэбныя семінары. Не засталася ў баку і Мастоўская цэнтральная бібліятэка. Першы такі семінар адбыўся ў маі 2010 года. Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка стала месцам правядзення семінара прадстаўнікоў бібліятэчных устаноў культуры Шчучынскага і Мастоўскага раёнаў па тэме “Бібліятэка – асяродак выхавання, інтэлектуальнага і творчага развіцця дзяцей і падлеткаў”. На прыканцы семінару ўдзельнікаў запрасілі на экскурсію “Вяртанне да вытокаў – дарога ў будучыню” ў аграсядзібу “Марчукова хата”.







У кастрычніку 2010 года мы запрасілі калег са Шчучына на зваротны абменны семінар пад назвай “Імідж бібліятэкі і бібліятэкара як паказчык якасці абслугоўвання насельніцтва”. Цікавым і забаўляльным для ўдзельнікаў семінару адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Натхненне” пад назвай “Мая прафесія – бібліятэкар!”.









У кастрычніку 2013 года Мастоўская бібліятэка запрасіла калег з Ваўкавысскага раёну на семінар “Роля бібліятэчных устаноў у папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны”.







У маі **2014** года мы наведалі Ваўкавысскую ЦБС на зваротны абменны семінар пад назвай “Бібліятэка ў дзіцячым фармаце: алгарытм узаемаадносін”.









З ліпеня 2013 года дырэктарам Мастоўскай ЦБС прызначаецца ***Стэльмах Таццяна Іосіфаўна*** - энергічны, крэатыўны, малады кіраўнік.

У Мастоўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме Таццяна Іосіфаўна працуе з **1992** года. Спачатку бібліятэкарам Малькавіцкай сельскай бібліятэкі, потым метадыстам, галоўным бібліятэкарам аддзела бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай бібліятэкі, галоўным спецыялістам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мастоўскага райвыканкама. Агульны стаж работы ў бібліятэцы складае больш за **20** гадоў.

Таццяна Іосіфаўна зарэкамендавала сябе ўмелым кіраўніком, адказным кваліфікаваным спецыялістам, ініцыятыўным творчым работнікам.

Пад кіраўніцтвам Таццяны Іосіфаўны бібліятэкі горада і раёна працуюць у рытме сённяшняга дня. Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці бібліятэк Мастоўскай ЦБС з’яўляюцца: пераход на новыя тэхналогіі, пераўтварэнне бібліятэк у цэнтры прававой

інфармацыі, пошук дадатковага фінансаваня, развіццё платных паслуг, інфармацыйна-культурнай дзейнасці. У работу бібліятэк укараняюцца новыя формы массавай работы.

З мэтай прыцягнення цікавасці насельніцтва да кнігі і чытання цэнтральная бібліятэка арганізавала **культурна-забаўляльную прастору ”Храм мудрага дуба”.** Любы жадаючы, зручна размясціўшыся ў крэсле ў цені дуба, які расце каля бібліятэкі, можа пачытаць кніжныя навіны, пагартаць часопісы, атрымаць поўныя звесткі аб бібліятэчных паслугах. На пляцоўцы побач з бібліятэкай была аформлена выстава кніг і часопісаў ”Літаратурная паляна”, арганізавана зона адпачынку для дзяцей, дзе можна пагуляць на міні-батуце.













По ранейшаму дорыць радасць літаратурна-музычная гасцёўня “Натхненне”, якой у 2014 годзе споўнілася 30 гадоў. У 2000-я гады ў ёй адбыліся творчыя сустрэчы з мясцовымі аўтарамі: ***А.Кандратовіч, Г.Васілеўскай***;





з пісьменнікамі і паэтамі Гродзеншчыны: ***Л.Кебіч, А.Нікіпорчык, Б.Ермашкевіч, М.Шаўчонак, У.Палякоў, І.Шатыронак;***








з рэспубліканскімі літаратарамі: выдатным дзіцячым пісьменнікам ***Валерыем Квілорыя*** і паэткай, выканаўцай уласных песень, аўтарам дзіцячых вершаў і сур'ёзных біяграфічных манаграфій ***Таццянай Дашкевіч.***




з расійскім пісьменнікам, гісторыкам ***А.Чароміным.***





Лірычную афарбоўку мерапрыемствам, якія праходзяць у літаратурна-музычнай гасцёўні "Натхненне" часта надае выступленне народнага ансамбля народнай песні "Ярыца". Шчырыя песні ў выкананні ансамбля нікога не пакідалі абыякавымі.





З мэтай далучэння да кнігі, чытання і павышэння ўзроўню чытацкай актыўнасці насельніцтва, ад Мастоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі былі адкрыты перасоўныя пункты выдачы на прадпрыемствах і ўстановах горада. Дзякуючы іх дзейнасці, чытачы маюць магчымасць знаёміцца з перыядычнымі выданнямі, навінкамі літаратуры, тэматычнымі падборкамі кніг на сваіх працоўных месцах.

***- ГУ "Мастоўскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі"***





***- КУП "Мастоўскае прадпрыемства меліяратыўных сістэм"***



*- ДП “Мастоўская сельгастэхніка”*





У 2000-я гады сваю працоўную дзейнасць у цэнтральнай бібліятэцы пачалі: ***С.І.Лазарэнка, Н.В.Бурчык, А.М.Краскоўская, І.П.Міхалевіч, Г.І.Васілеўская, І.З.Кавалеўская, В.А.Леўчык, Т.С.Чарніцкая, А.С.Рабецкая, Г.М.Міканава, М.У.Шчука.***

## Бібліятэка 2000-х - гэта мы!!!

























СВИДЕТЕЛЬСТВО

о государственной регистрации юридического лица

Мостовский районный исполнительный комитет
**1 сентября 2014 г.** в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей внесена запись о государственной регистрации

**Государственного учреждения культуры "Мостовская районная библиотека"**
**(Мостовская районная библиотека)**

с регистрационным номером **591663983**.

Главный специалист отдела экономики Т.К.Поклад

0033171

У сучасных умовах некаторыя ўстановы культуры Рэспублікі Беларусь праводзяць рэарганізацыю ва ўстаноўленым законам парадку і набываюць статус юрыдычнай асобы. Не засталася ў баку і наша бібліятэка.

У жніўні **2014** года з мэтай найбольш поўнага задавальнення інфармацыйных патрэб грамадзян, удасканалення бібліятэчнага абслугоўвання жыхароў Мастоўскага раёна, Мастоўскі раённы выканаўчы камітэт вырашыў стварыць на базе Мастоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўную ўстанову культуры «Мастоўская раённая бібліятэка» (ДУК «Мастоўская раённая бібліятэка»).

Згодна Статута ДУК «Мастоўская раённая бібліятэка» з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, інфармацыйнай, дасугавай і асветніцкай установай культуры, якая ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь ”Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь і Статутам.

**2014 год**
**Чытачы - 5864**
**Кнігавыдача - 117977**
**Наведванні - 42000**
**Кніжны фонд - 136205**

## *Яны праслаўлялі культуру Мастоўшчыны*



*І ў маленстве, і ў старасці сталай, непакояць пытанні людзей...*
*Мы адказы шукаем, шукаем... Свет вялікі навокал... А дзе?*
*Кожнаму адкужу чалавеку: - Павялося так спрадвеку -*

**За адказам - ідзі ў БІБЛІЯТЭКУ!**

*Ты жывеш сярод людзей, лепшай долі ўсе шукаюць людзі...*
*Твой жа шлях якім жыццёвы будзе? Што ўладкуецца з надзей?*
*Кожнаму адкажу чалавеку: - Павялося так спрадвеку -*

**Шукаць свой шлях - ідзі ў БІБЛІЯТЭКУ!**

*Хто ў школе... хто на працы... Дзень за днём кудысь бяжыць...*
*Можа нехта мае рацыю: дзе і як нам адпачыць?*
*Кожнаму адкажу чалавеку: - Павялося так спрадвеку -*

**Хочаш адпачыць - ідзі ў БІБЛІЯТЭКУ!**

*І ў маленстве, і ў старасці сталай, людзі разам стараюцца жыць.*
*Бо ў жыцці спраў вялікіх не мала... Аднаму ж усяго - не зрабіць.*
*І заўсёды думка паўставала: дзе ж сяброў-таварышоў набыць?*

Кожнаму адкажу чалавеку: - Павялося так спрадвеку -

**За сябрамі - трэба ісці ў БІБЛІЯТЭКУ!**

Мастоўская цэнтральная раённая бібліятэка

Масты, 2015